Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛЮТАГА 2015 г. ПЯТНІЦА № 38 (27896) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Часы мяняюцца — «Радыёфакт» застаецца

СТАР. 5

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Абяцаная шапка вушэй не грэе

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:

«Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, Рэспубліка Беларусь не стварае праблем сваім суседзям, у нашай краіне адсутнічаюць канфлікты на міжнацыянальнай і рэлігійнай глебе. Беларусь уносіць свой істотны ўклад у вырашэнне такіх агульнаеўрапейскіх задач, як забеспячэнне рэгіянальнай стабільнасці, надзейнага транзіту тавараў і энерганосьбітаў, барацьба з наркатрафікам і гандлем людзьмі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.02.2015 г.

Долар ЗША	14750,00	▼
Еўра	16760,00	▼
Рас. руб.	243,50	▲
Укр. грыўня	453,85	▲

ISSN 1990 - 763X

Семестр — на «выдатна»

Фота Надзеі БУЖАН.

Пераможцы атрымалі памятныя дыпломы і шкляныя кельмы.

У музеі Вялікай Айчыннай вайны падвялі вынікі рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр» на найлепшыя студэнцкі атрад і арганізацыю. Сярод пераможцаў — экалагічны атрад «Бярэзінскі біясферны запаведнік», які на цырымоніі прадстаўлялі камандзір Аляксандр АНГУР і Аляксандра ЛУГАЎСКАЯ *(на фота)*. Студатрадаўскі рух — адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці БРСМ. У 2014 годзе рознымі формамі другаснай занятасці моладзі структуры Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў было ахоплена больш за 139 тысяч чалавек. Цікава, што толькі ў складзе 2996 студэнцкіх атрадаў працавала каля 60 тысяч.

ЯНЫ — ЛЕПШЫЯ!

У Мінску ўручылі спартыўныя «Оскары»

На ўрачыстай цырымоніі падвядзення вынікаў адкрытага публічнага конкурсу «Трыумф. Героям спорту — 2014» у сталічным Палацы спорту былі названы лепшыя спартсмены і спартыўныя моманты мінулага года.

У ходзе конкурсу беларускія аматары спорту і журы вызначалі спартсменаў, якія дабіліся ў 2014 годзе найбольш значных вынікаў на буйных афіцыйных міжнародных спаборніцтвах. Галасаванне заўзятараў доўжылася тры тыдні, у ім прынялі ўдзел каля паўтара мільёна чалавек, у тым ліку і чытачы «Звязды».

Аматары спорту па традыцыі выбіралі сваіх фаварытаў у чатырох намінацыях: «Трэнер года», «Спартсмен года», «Спартсменка года» і «Каманда года». Яшчэ ў чатырох («Самы яркі момант года», «Прарыў года», «Вынік года» і «За волю да перамогі») пераможцаў вызначыла журы конкурсу. Фіналам праекта стала цырымонія ўрачыстага ўзнагароджання пераможцаў і гала-канцэрт з удзелам артыстаў беларускай эстрады.

Галоўным героем урачыстасці стала **трохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я ДОМРАЧАВА,** яна выйграла бронзавыя статуэткі адразу ў дзвюх намінацыях: **«Спартсменка года»** і **«Вынік года».** Сама Даша не змагла прысутнічаць на цырымоніі — рыхтуецца да чэмпіянату свету, але яна выйшла на сувязь з беларускімі заўзятарамі з Рупольдынга з дапамогай скайпа.

СТАР. 4

Фота Надзеі БУЖАН.

ЧАС ПРАКТЫЧНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Прэзідэнт — ураду: пара выходзіць з кабінетаў і займацца канкрэтнай вытворчасцю

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка арыентуе членаў урада і старшынь аблвыканкамаў на непасрэдны практычны ўдзел у вырашэнні тых ці іншых пытанняў у развіцці краіны і асобных галін ва ўмовах існуючых цяжкасцей у эканоміцы. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, паведамляе БЕЛТА.

«Ужо вядомы першыя вынікі студзеня, ды і люты скончыўся. Нягледзячы на некаторыя станоўчыя вынікі ў асобных галінах, у цэлым эканоміка не расце. Адстае прамысловасць, павялічваюцца запасы на складах і ўзаемныя неплацяжы. Пакуль не спрацоўваюць прымаемыя меры падтрымкі экспарту. І ўсё гэта пачынае ўплываць на людзей. Рэальныя даходы не растуць», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Мы ведаем, што такія праблемы сёння не толькі ў нас. Але нельга ўсё звальваць на знешнія фактары», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ад кіраўніцтва ўрада кіраўнік дзяржавы запатрабаваў прадставіць не толькі справаздачу аб бягучай сітуацыі, але і выказаць канкрэтныя прапановы, а таксама далажыць пра выкананне раней дадзеных даручэнняў. «Даўно пара ўжо вылазіць з кабінетаў і займацца канкрэтнай вытворчасцю. Сёння гэта пытанне нумар адзін, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вы прынялі праграму дзеянняў, далажылі яе дэпутатам, як і належыць па заканадаўстве. Але мяне сёння цікавіць не гэта. Распрацаваныя вамі сцэнарыі — тры-пяць або дзесяць — гэта выключна ваша справа. Мяне цікавіць тэндэнцыя, зрухі, што зроблена для таго, каб элементарна, прадаўшы прадукцыю, атрымаць грошы».

Прэзідэнт строга папярэдзіў аб недапушчальнасці наяўнасці пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці за пастаўленую за мяжу прадукцыю. «Гэта крымінальнае злачынства. Мы ўжо вывелі гэту праблему на ўзровень пракуратуры Беларусі і Расіі», — адзначыў Прэзідэнт.

Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў далажыў на нарадзе пра стан спраў у эканоміцы і планах урада па вырашэнні існуючых праблем. Паводле яго слоў, снежаньскі шок ад дэвальвацыі расійскага рубля, фактычнае сцісканне ўнутранага расійскага рынку вельмі негатыўна паўплывалі на беларускую эканоміку. «Відавочна, што жорсткія меры балансіроўскі эканомікі, якія былі рэалізаваны ў снежні-студзені, не маглі не паўплываць на рэальны сектар і яго фінансавы стан. Таму сёння да задачы аднаўлення нармальнай работы прамысловасці ў шырокім яе разуменні зводзяцца ключавыя пытанні эканамічнай палітыкі. На гэта завязаны банкаўская сістэма, экспарт, занятасць і даходы насельніцтва», — сказаў Андрэй Кабякоў.

САКАВІЦКІ ГРАФІК ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 2-3 сакавіка зробіць візіт у Расійскую Федэрацыю для ўдзелу ў пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. На пасяджэнні будуць разгледжаны ключавыя пытанні далейшага функцыянавання Саюзнай дзяржавы, уключаючы фарміраванне саюзнага бюджэту, правядзенне ўзгодненай знешняй палітыкі, развіццё сацыяльна-гуманітарнай сферы. Плануецца таксама звярнуцца да найбольш актуальных пытанняў двухбаковых беларуска-расійскіх адносінаў.

А ў сярэдзіне сакавіка Аляксандр Лукашэнка мае намер зрабіць візіт у Казахстан. Аб гэтым ён дамовіўся са сваім калегам Нурсултанам Назарбаевым падчас тэлефоннай размовы, што адбылася па ініцыятыве казахстанскага боку. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі шэраг пытанняў двухбаковага парадку дня, супрацоўніцтва ў інтэграцыйных структурах.

■ Парламенцкі дзённік

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

«ЯК ЕЎРАПЕЙСКАЯ ДЗЯРЖАВА МЫ МАЕМ ПРАВА ПРАЦАВАЦЬ У ЕЎРАПЕЙСКІХ СТРУКТУРАХ»

Дарожную карту далейшых адносінаў Нацыянальнага сходу нашай краіны і Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы прапанаваў распрацаваць Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі, падчас сустрэчы з Андрэа Рыгоні, дакладчыкам па Беларусі Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі.

— У пэўнай ступені мы калегі — абодва і эканамісты, і палітыкі, — заўважыў Міхаіл Мясніковіч. — Таму, думаю, мы знойдзем агульную мову. Адразу хацеў бы адзначыць, што Беларусь як еўрапейская дзяржава мае права разлічваць на паўнавартасную працу ў еўрапейскіх структурах. Безумоўна, ад вашай пазіцыі, вашага даклада многае залежыць.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў канструктыўны падыход Андрэа Рыгоні як дакладчыка.

— Мы станоўча ставімся да вашых заяў аб гатоўнасці размарозіць стасункі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы з Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, — заявіў старшыня Савета Рэспублікі. — Асабліва радуе тое, што, як вы самі неяк сказалі, падрыхтоўка даклада будзе ісці з чыстага ліста, без старых падыходаў, сфарміраваных раней.

Старшыня Савета Рэспублікі прапанаваў бакам распрацаваць дарожную карту далейшых адносінаў. Паводле яго слоў, было б добра запрасіць беларускіх парламентарыяў на сесію ПАСЕ. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў Андрэа Рыгоні ініцыяваць такое запрашэнне ўжо на красавіцкую сесію асамблеі.

— Напэўна, падчас абмеркавання розных праблем еўрапейскім парламентарыям было б цікава пачуць пазіцыю беларускага боку па такіх пытаннях, як гандаль людзьмі, гвалт у адносінах да жанчын, абарона дзяцей, — гэта значыць па тых актуальных тэмах, якія сёння на парадку дня ў Еўропе. Таксама, на наш погляд, важным з'яўляецца пытанне ўзаемаадносінаў ПАСЕ і Міжпарламенцкай асамблеі СНД.

Акрамя таго, на думку Міхаіла Мясніковіча, важнай з'яўляецца тэма ўзаемадзеяння Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы з беларускім Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, які створаны і працуе пры Савеце Рэспублікі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Гатоўнасць да дыялогу

Праграмай візіту ў нашу краіну Андрэа Рыгоні, дакладчыка па Беларусі Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях і дэмакратыі, былі прадугледжаны сустрэчы з кіраўнікамі розных міністэрстваў і ведамстваў дзяржавы.

У прыватнасці, падчас сустрэчы з **міністрам інфармацыі Ліліяй АНАНІЧ** абмяркоўваліся перспектывы адкрытага дыялогу з Еўропай. Па словах міністра інфармацыі, у кантэксце сучасных падзей асабліва важна, каб ён адбываўся. «Калі спыняецца дыялог, пачынаюць гаварыць іншыя сродкі, — і гэта далёка не заўсёды на карысць», — заўважыла Лілія Ананіч.

Яна падкрэсліла, што Беларусь дэманстравала сваё міралюбства, адкрытасць свету на працягу ўсіх гадоў, калі перапыніўся дыялог з Саветам Еўропы. Важна, каб інфармацыя працягвала служыць міру. Лілія Ананіч адзначыла, што знаходжанне ў краіне дазволіць госцю атрымаць вялікі аб'ём звестак па ўсіх пытаннях, якія могуць зацікавіць дакладчыка, а Міністэрства інфармацыі гатова да адкрытага дыялогу і абмеркавання ўзаемных крокаў па збліжэнні.

Падчас знаходжання ў Мінску Андрэа Рыгоні сустрэўся са старшынёй Цэнтральнай камісіі нашай краіны па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй Ярмошынай, міністрам юстыцыі Алегам Сліжэўскім, міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, выкладчыкамі і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

■

■ Знешняя палітыка

АКНО МАГЧЫМАСЦЯЎ АДЧЫНЕНА

Калегія Міністэрства замежных спраў разгледзела вынікі працы знешнепалітычнага ведамства краіны за мінулы год. Асноўнай тэмай абмеркавання стала развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі.

Як заўважыў **Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў**, мінулы год выдаўся вельмі складаным для беларускай дыпламатыі.

— Беспрэцэдэнтнае абвастрэнне сітуацыі ў нашым рэгіёне ў сувязі з украінскім крызісам, жорсткае супрацьстаянне вядучых сусветных гульцоў, санкцыйныя войны паміж Расіяй і Захадам аказалі сур'ёзны негатыўны ўплыў на развіццё сусветнага гандлю, пагоршылі крызісныя з'явы ў эканоміках сумежных з намі дзяржаў і, як вынік, выклікалі рэзкае сцісканне традыцыйных для Беларусі рынкаў збыту, — адзначыў міністр. — У той жа час узважаныя знешнепалітычныя падыходы Беларусі ў значнай ступені спрыялі больш пільнай увазе да краіны і яе кіраўніцтва, пераацэнцы месца і ролі Беларусі ў глабальных і рэгіянальных працэсах.

Той спрыяльны інфармацыйны і знешнепалітычны фон, які зараз сфарміраваўся, па меркаванні кіраўніка дыпламатычнага ведамства, адчыняе новае акно магчымасцяў для нашай краіны, і гэтыя магчымасці варта максімальна эфектыўна выкарыстоўваць у першую чаргу для нарошчвання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

На калегіі прысутнічаў і **пасол Беларусі ва Украіне Валянцін ВЯЛІЧКА**. Ён расказаў журналістам, што кожны дзень у пасольства паступае да 30 зваротаў з просьбамі пераехаць у Беларусь на пастаяннае месца жыхарства, вучобу. Па яго інфармацыі, да нас перабралася ўжо больш за 60 тысяч чалавек.

* * *

Як паведамляецца ў апублікаваным раней дакладзе аб дзейнасці Міністэрства замежных спраў Беларусі за 2014 год, сёння наша краіна прадстаўлена 67 замежнымі ўстановамі ў 56 дзяржавах свету. У мінулым годзе з'явіліся беларускія пасольствы ў Аўстраліі, Катары, Манголіі, Пакістане, Эквадоры, а таксама генеральнае консульства ў Мілане (Італія). Акрамя гэтага, знешнегандлёвымі партнёрамі нашай краіны сталі 207 дзяржаў свету. У дзевяць краін беларуская прадукцыя пастаўлялася ўпершыню.

У 2014 годзе ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны з Дэмакратычнай Рэспублікай Усходні Тымор. Такім чынам, нашай дзяржавай падтрымліваюцца дыпламатычныя адносіны са 174 дзяржавамі свету, што складае больш за 90 працэнтаў ад агульнай колькасці дзяржаў — членаў ААН.

Вялікая ўвага надавалася таксама развіццю двухбаковай дагаворна-прававой базы ў галіне ўзаемнай адмены віз. Падпісаны міжурадавыя пагадненні па візавых пытаннях з Ізраілем, Камбоджай, Эквадорам, уступілі ў сілу пагадненні з Балівіяй, Лаосам, Манголіяй, ААЭ, Турцыяй, Шры-Ланкай. На сёння грамадзяне 17 дзяржаў могуць уязджаць у Рэспубліку Беларусь без віз.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

«Прамая лінія» «Звязды»

НА СУВЯЗІ — МІНІСТР ЖКГ

Ці будуць у найбліжэйшы час павялічвацца тарыфы на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі? За кошт чаго і калі можна чакаць павышэння якасці абслугоўвання насельніцтва і аб якіх новых метадах эфектыўнага зніжэння сабекошту паслуг можа ісці гаворка? Якім чынам у будучыні запланавана ажыццявіць рэформу ЖКГ?

На гэтыя і іншыя пытанні чытачам «Звязды» адкажа міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны Аляксандр Аляксандравіч ЦЕРАХАЎ падчас прамой лініі, што адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» ў сераду 4 сакавіка з 12.00 да 13.00. У гэты час свае пытанні міністру можна будзе задаць па тэлефоне: 287-18-71.

Каб папярэдне пакінуць свае пытанні, дасылайце іх на электронны адрас **(info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «Прамая лінія») ці тэлефануйце па нумары: 287-17-51.**

Цэнтральны камітэт Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі інфармуе, што 3 красавіка 2015 года ў г. Мінску

АДБУДЗЕЦЦА VIII ЧАРГОВЫ З'ЕЗД ГАЛІНОВАГА ПРАФСАЮЗА.

Месца правядзення — **Рэспубліканскі палац культуры прафсаюзаў.**

Пачатак **у 10.00**. Рэгістрацыя дэлегатаў **з 9.00**.

Дадатковая інфармацыя аб правядзенні з'езда на сайце галіновага прафсаюза **http://estu.by.**

УНП 100060327

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1033903-1033913, 1120258-1120266, 1209343, 1209363, 1209393, 1209395, 1209396, 1209411, 1240025, 1240076, 1240082, 1240083, 1273283, 1273284, 1273348, 1291214, 1291234, 1268741, 1338825, 1059627;

- добровольное страхование от несчастных случаев (2РН, 2РП) серия НС №№ 0006814, 0017890;

- страховой полис «Универсальный» (2РН, 2РП) серия УП № 0000257;

- добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) ф. 2РН, 2РП серия АК №№ 0089329, 0034701.

УНП 100782388

Свидетельство о государственной регистрации и печать УП «Виктория-СНОВ» (УНП 190454573) **считать недействительными в связи с утерей.**

Уважаемые акционеры ОАО «Белбакалея»!

27 марта 2015 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Белбакалея»

по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе за 2014 год.
2. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и об основных направлениях развития Общества на 2015 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2014 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2015 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными по вопросам повестки дня собрания, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, комната № 8 с 9.00 до 17.00 (понедельник–пятница) с 10 по 26 марта 2015 года, 27 марта 2015 года – по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 1 марта 2015 года.

Регистрация участников собрания 27 марта 2015 года с 9.00 до 13.45 по месту проведения собрания. Начало работы собрания – 27 марта 2015 года в 14.00.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100025653 *Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»*

ВЫКАРЫСТОЎВАЎ ЧУЖЫЯ РУКІ

Дырэктара сталічнага камбіната хлебапрадуктаў падазраюць у службовых злоўжываннях. Матэрыяльная шкода склала больш за 70 мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Партызанскага РУУС устанавілі, што кіраўнік прадпрыемства на працягу трох гадоў выкарыстоўваў магчымасці прадпрыемства — рабочую сілу, інструменты, транспарт — пры будаўніцтве на ўласным участку, пры рамонце кватэры дачкі, а таксама пры добраўпарадкаванні месца пахавання маці. Заведзена крымінальная справа, праводзіцца расследаванне. Падазраванаму пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да шасці гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Падземка

МЕТРО ВЫХОДЗІЦЬ НА ПАВЕРХНЮ

Першыя станцыі трэцяй лініі мінскага метро запрацуюць у 2018 або 2019 годзе.

Такія тэрміны здачы чатырох першых станцый новай лініі («Кавальскай Слабады», «Вакзальнай», «Плошчы Багушэвіча» і «Юбілейнай») акрэсліў падчас прэс-канферэнцыі **начальнік прадпрыемства «Дырэкцыя па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна» Павел ЦАРУН.** Па яго словах, зараз метрабудаўнікі працуюць над першай чаргой будаўніцтва, у прыватнасці над станцыямі «Кавальская Слабада» і «Вакзальная».

Летась на будаўніцтве трэцяй лініі было асвоена 68 мільярдаў рублёў. У асноўным вялася праца па зносе старых будынкаў, пераважная большасць з якіх — адміністрацыйнага прызначэння. Агульная колькасць пабудоў, што падлягаюць зносу, — каля 140. Сёлета на будаўніцтва запланавана патраціць 981 мільярд рублёў.

Павел Царун пацвердзіў інфармацыю аб тым, што на станцыях трэцяй лініі метро пасажыраў будуць чакаць пэўныя новаўвядзенні. Сярод іх — так званыя «экраны», якія не дазваляюць трапіць на пуці староннім прадметам або людзям (дзверы «экрана» адчыняюцца толькі пасля спынення вагонаў) і цягнікі з аўтаматызаваным рухам (машыніст будзе толькі кантраляваць працу электронікі). На перасадачным вузле «Плошча Леніна» — «Вакзальная», даўжыня якога складзе каля 200 метраў, будзе выкарыстоўвацца травалатар (эскалатар з гарызантальным рухам). Таксама ў сталіцы з'явіцца першы наземны вестыбюль — на станцыі «Вакзальная». Такі крок абумоўлены невялікай глыбінёй яе залягання. Што датычыцца саставаў, якія будуць перавозіць пасажыраў на трэцяй лініі, то, па непацверджанай пакуль інфармацыі ад прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн», гэта будуць цягнікі вытворчасці беларускашвейцарскага завода «Штадлер Мінск».

Паводле слоў Паўла Царуна, зараз адбываецца карэкціроўка генплана беларускай сталіцы. Пасля яго зацвярджэння будзе створана новая транспартная схема Мінска, у адпаведнасці з якой павінна праектавацца чацвёртая лінія метро. Папярэдне, яе даўжыня будзе складаць прыкладна 19 кіламетраў, на якіх размесцяцца 12 станцый.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

■ Надвор'е

ІЗНОЎ ДОЖДЖ І ЧАСАМ МОКРЫ СНЕГ

А на выхадныя прыгрэе да плюс 9 градусаў

У пятніцу тэрыторыя краіны застанецца пад уплывам цёплых паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку поўдня Еўропы. Пра гэта паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў многіх краінах пройдуць ападкі (дождж і мокры снег), а максімальная тэмпература паветра складзе 1-7 цяпла. Захаваецца цёплае надвор'е і ў выхадныя. У суботу і нядзелю, пры паніжаным фоне атмасфернага ціску, месцамі па Беларусі пройдуць непрацяглыя ападкі ў выглядзе дажджу і часам мокрага снегу. У асобных раёнах магчымы туман, уначы і раніцай месцамі — слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень будзе ад 2 да 7 цяпла, а па поўдні Беларусі — да плюс 9 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня на тэрыторыю краіны завітаюць атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы. Яны прынясуць мокры снег і дождж на большую частку Беларусі. Месцамі — туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень з панядзелка па сераду прагназуецца 1-7 цяпла. Сіноптыкі не выключаюць, што бліжэй да 8 сакавіка ў нас можа крыху пахаладнець. Гэта і не дзіўна, бо вясна толькі пачынаецца...

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Небяспека

ЯШЧЭ АДНА АХВЯРА

У Брэсце на возеры жылога раёна Вычулкі загінуў падлетак.

Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, у сераду вечарам хлопцы 1999 і 2000 гадоў нараджэння выйшлі на возера. На адлегласці 15 метраў ад берага яны праваліліся пад лёд, пачалі тануць і клікаць на дапамогу. Відавочцы патэлефанавалі выратавальнікам. Адзін з жыхароў мікрараёна кінуўся на дапамогу. 25-гадовы мужчына змог выцягнуць хлопца з ледзянога палону і перадаць брыгадзе хуткай дапамогі — падлетак шпіталізаваны ў дзіцячую абласную бальніцу з дыягназам «пераахаладжэнне». Праз гадзіну вадалазы дасталі з вады цела другога падлетка.

— Чаму людзі праяўляюць такую фатальную неабачлівасць?! — не разумее **супрацоўнік абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ.** — Пра небяспеку тонкага лёду трубяць, здаецца, усе СМІ. І ўсё роўна ідуць: і дзеці, і дарослыя. Выратаваць чалавека ў такой сітуацыі вельмі цяжка. Аўтамабілю МНС не дабрацца да месца здарэння менш чым за 5-7 хвілін. А для чалавека, які праваліўся пад лёд, гэта многа: тут усё вырашаюць секунды. Нельга рызыкаваць жыццём так бяздумна.

• ДАРЭЧЫ

ВЫХОДЗІЦЬ НА ЛЁД ЗАБАРОНЕНА

Большасць старшынь рай- і гарвыканкамаў Брэсцкай вобласці падпісалі распараджэнне аб забароне выхаду на лёд.

З такой ініцыятывай выступіў **кіраўнік абласнога таварыства выратавання на водах Рамуальд САДОЎСКІ,** і яго заклік пачулі. Нягледзячы на цёплае надвор'е і тонкі лёд, на многіх вадаёмах настойліва і ўпарта працягваюць сядзець аматары зімовай рыбалкі. Вынікі такой неабачлівасці суайчыннікаў — у студзені-лютым пяцёра загінулых, якія менавіта праваліліся пад лёд. А нядаўна ў Столінскім раёне загінуў падлетак: ён катаўся на каньках на рацэ. Дакумент, які падпісваюць у раёнах, прадугледжвае забарону выхаду на лёд, калі яго таўшчыня не дасягае 7 сантыметраў. Такое становішча зафіксавана ў 10 раёнах вобласці. Чакаецца, што астатнія кіраўнікі падпішуць распараджэнне днямі.

Яна СВЕТАВА.

15 ХВІЛІН У ХАЛОДНАЙ ВАДЗЕ

Два мужчыны ледзьве не сталі ахвярамі тонкага лёду на возеры каля вёскі Стокі Свіслацкага раёна.

Выратавальнікам патэлефанаваў відавочца. 15 хвілін, пакуль найбліжэйшае падраздзяленне МНС дабіралася да месца здарэння, пацярпелыя знаходзіліся ў халоднай вадзе на адлегласці 30 метраў ад берага.

Пацярпелых 1971 і 1960 гадоў нараджэння, работнікаў ЖКГ і чыгункі, дасталі пры дапамозе выратавальных дошкі і вяроўкі. У момант здарэння мужчыны рыбачылі. Абодвух даставілі ў бальніцу з агульным пераахаладжэннем арганізма

■

СКРАЎ ВЕЛАСІПЕД... З 22-га ПАВЕРХА

Цэнтральнае РУУС сталіцы вышуквае невядомага, які скраў горны веласіпед.

Ды не адкуль-небудзь, а з тамбура на 22-м паверсе дома па вуліцы Мястроўскай. Як той казаў, не паленаваўся... Мужчына зайшоў у пад'езд, падняўся на ліфце, узяў двухколавую машыну коштам 2,5 мільёна рублёў і пакінуў з ёй дом. Аднак злодзея зафіксавалі камеры відэаназірання, размешчаныя ў пад'ездзе і на вуліцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота БЕЛТА.

Мінскія «зубры» супраць фінскіх «джокераў»

Сапернікі мінчан па першым раўндзе плэй-оф — фінскі «Ёкерыт». Старт сёння

Хакейнае мінскае «Дынама» другі раз у сваёй гісторыі прабілася ў плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі. Нашы хакеісты занялі 5-е месца па выніках рэгулярнага чэмпіянату (у канферэнцыі «Захад»), і таму ў матчах 1/4 фіналу накаўт-раўнда Заходняй канферэнцыі ім трэба будзе згуляць з камандай Фінляндыі, якая стала 4-й.

Галоўны трэнер мінчан Любамір ПОКАВІЧ падвёў вынік выступлення «Дынама» ў «рэгулярцы» і расказаў пра будучага саперніка.

— З «Ёкерытам» мы гулялі дастаткова часта, гэта сапернік з нашага дывізіёна. Там выступае найлепшы снайпер чэмпіянату — Мозес, добрыя абаронцы. Гэта каманда, якая аддае перавагу рацыянальнаму хакею, рэдка памыляецца. Скажу, што яны гуляюць у хакей, як тыповыя фіны. Калі б перад сезонам нам хто-небудзь сказаў, што мы будзем на пятым месцы ў канферэнцыі, мы б узрадаваліся такому выніку. Былі добрыя і дрэнныя матчы, але такое бывае ў кожнай каманды. У прынцыпе, рэгулярным чэмпіянатам мы задаволеныя.

Покавіч адзначыў, што трэнерскі штаб ужо вызначыўся з першым варатаром на гульні ў плэй-оф, але называць прозвішча не стаў. Таксама трэнер падкрэсліў, што менавіта добрыя варатар і абаронцы становяцца галоўным фактарам поспеху ў плэй-оф.

Першая сустрэча адбудзецца ўжо сёння ў Хельсінкі, другая — заўтра там жа. 2 і 3 сакавіка пройдуць гульні ў Мінску, калі спатрэбіцца — 5 сакавіка каманды вернуцца ў Фінляндыю, 7 сакавіка згуляюць у Мінску, 9 сакавіка — у Хельсінкі. Нагадаем, каб прайсці ў наступны раўнд плэй-оф, адной з камандаў неабходна атрымаць чатыры перамогі.

Нападаючы «Дынама-Мінск» Шарль ЛІНГЛЕ:

— Вядома, мы гатовыя да плэй-оф. Мы таксама ведаем, што плэй-оф — гэта не спрынт, а хутчэй марафон. Таму нам неабходна прыклаці ўсе нашы намаганні, каб выйграваць кожную гульню. Важна дзейнічаць граматна, і кожны гулец павінен быць гатовы да ўсяго адразу пасля першага ўкідвання.

Усе пары 1/8 фіналу

Захад

ЦСКА (Масква) — ХК «Сочы» (Сочы)
СКА (Санкт-Пецярбург) — «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад)
«Дынама» (Масква) — «Лакаматыў» (Яраслаўль)
«Ёкерыт» (Хельсінкі) — «Дынама» (Мінск)

Усход

«Ак Барс» (Казань) — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург)
«Сібір» (Новасібірск) — «Трактар» (Чалябінск)
«Металург» (Магнітагорск) — «Салават Юлаеў» (Уфа)
«Авангард» (Омск) — «Барыс» (Астана)

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 8» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Номер лота	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Размер задатка, бел. руб.
Лот № 1	Объекты недвижимости: 1. Капитальное строение, инв. № 100/С-40361 – котельная, общая площадь 355,6 м². 2. Капитальное строение, инв. № 100/С-54225, здание газораспределительного пункта, общая площадь 35,7 м². 3. Капитальное строение, инв. № 100/С-54224, мастерская АБЗ, общая площадь 62 м². 4. Капитальное строение, инв. № 100/С-40358, весовая, общая площадь 81,6 м². 5. Капитальное строение, инв. № 100/С-54227, эстакада. 6. Капитальное строение, инв. № 100/С-54226, подъездной железнодорожный путь, протяженностью 87 м.п. 7. Стоянка для автомобилей АБЗ, пл. 5005 м². 8. Капитальное строение, инв. № 100/С-54231, сети водопроводные к котельной, протяженностью 169 м.п. 9. Капитальное строение, инв. № 100С/54232, сети водопроводные к котельной, протяженностью 44 м.п. 10 Капитальное строение, инв. № 100С/54231, сети канализационные от котельной, протяженностью 113 м.п. 11. Капитальное строение, инв. № 100С/54231, сети канализационные от котельной, протяженностью 84 м.п. 12. Капитальное строение, инв. № 100С/-54229, газопровод к котельной, протяженностью 73 м.п. 13. Капитальное строение, инв. № 100С/54234, кабельная линия электропередач от котельной, протяженностью 133 м.п. 14. Капитальное строение, инв. № 100С/54236, кабельная линия электропередачи к весовой, протяженностью 43 м.п., **расположенные на земельном участке пл. 0,7907 га с кадастровым номером 140100000001028407**	3 017 624 800	301 762 480

Местонахождение объекта	Брестская область, г. Брест, ул. Катин Бор, 95В
Характеристики замельного участка	Земельный участок выделен для обслуживания зданий и сооружений на праве постоянного пользования
Условия продажи	Без условий
Продавец (Балансодержатель)	ОАО «Строительный трест №8»
Организатор торгов	ОАО «Строительный трест №8»
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 10-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Шаг аукциона	5% от начальной цены лота
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012121884440 в Региональной Дирекции № 100 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, получатель платежа ОАО «Строительный трест № 8»

Аукцион состоится 10 марта 2015 г. в 11.00 по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний ОАО «Строительный трест № 8», каб. 230, 231

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ОАО «Строительный трест № 8».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, каб. 418 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Последний день приема заявлений – 09 марта 2015 г. до 17.30.

Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8-(0162) 22-01-72.

На відэасувязі — Дар'я ДОМРАЧАВА.

ЯНЫ — ЛЕПШЫЯ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Біятланістка адзначыла, што вельмі рада атрымаць такое прызнанне, падзякавала ўсім, хто галасаваў за яе, і асабліва сваёй сям'і.

— Гэта быў той вынік, да якога я ішла доўгія гады, у які ўклала на той момант усе свае сілы і вопыт; вынік, у які ўклалі сілы ўсе мае трэнеры і ўся мая каманда. Асаблівы дзякуй хацелася б сказаць маёй сям'і. На жаль, таты ўжо няма з намі, але я адчуваю, што ён са мной і мне вельмі дапамагае. Мая матуля для мяне самая лепшая! Дзякуй майму брату, бо менавіта ён прывёў мяне ў секцыю біятлона.

Узнагароду Дар'і атрымлівала яе мама Ларыса Аляксееўна:

— Трэба сябраваць са сваімі дзецьмі, жыць з імі, радавацца кожнай самай маленькай перамозе, бо вялікія перамогі прыходзяць не адразу. Я вельмі рада за дачку. Яна змагла зрабіць амаль немагчымае: тройчы выйграла залатыя медалі на адной Алімпіядзе! Галоўнае, пасля перамогі Дар'і многія дзеці прыйшлі ў спартшколы і пачалі займацца лыжным спортам, біятлонам. Дар'я вельмі захоплена сваёй справай. Хачу ўсім пажадаць так ставіцца да сваёй працы, тады ў нас усё атрымаецца.

У намінацыі **«Каманда года»** перамагла жаночая нацыянальная каманда па біятлоне. Дзяўчаты занялі 5-е месца ў эстафеце на зімовых Алімпійскіх гульнях у Сочы.

Фрыстайліст Антон Кушнір стаў лепшым у намінацыі **«Спартсмен года»** — за званне чэмпіёна зімовых Алімпійскіх гульняў-2014 народнае журы аддала пяцьдзясят працэнтаў галасоў.

— Хачу сказаць дзякуй родным, блізкім, сям'і. Дзякуй за падтрымку. Асаблівая падзяка майму першаму трэнеру Галіне Пятроўне Досавай і, вядома ж, Мікалаю Іванавічу Казеку. Я магу сказаць, што вы найлепшы ў свеце трэнер па фрыстайле.

У пацвярджэнне слоў Антона Кушніра ўзнагароду ў намінацыі **«Трэнер года»** атрымаў «рулявы» нацыянальнай каманды па фрыстайле Мікалай Казека. Канкурэнцыю яму склаў біятлонны гуру — Клаус Зіберт. Намінантаў падзяліў усяго адзін працэнт галасоў.

— Нарэшце дачакаўся гэтай прэстыжнай прэміі. Рэцэпт поспеху просты: люблю сваю працу. Разлічваў атрымаць узнагароду пасля перамогі Аляксея Грышына ў Ванкуверы, але давялося выхаваць яшчэ двух алімпійскіх чэмпіёнаў, каб стаць лаўрэатам.

Бронзавая статуэтка ў намінацыі **«За волю да перамогі»** традыцыйна ўручаецца спартсменам-паралімпійцам. Сёлета ёю ўшанавалі Васіля Шаптабоя, ён стаў двухразовым бронзавым прызёрам зімовых Паралімпійскіх гульняў у Сочы па біятлоне сярод інвалідаў па зроку.

«Самым яркім спартыўным момантам года» названа перамога каманды Беларусі ў матчы з Латвіяй на чэмпіянаце свету па хакеі ў Мінску. Менавіта гэтая вікторыя дазволіла падапечным Глена Хэнлана выйсці ў 1/4 фіналу першынства.

У намінацыі **«Прарыў года»** перамогу атрымала алімпійская чэмпіёнка Ала Цупер. На сцэну па ўзнагароду спартсменка паднялася не адна: хутка другі раз Ала стане мамай.

Наступныя прэміі «Трыумф. Героям спорту» будуць раздадзены толькі праз два гады. Іх трыумфатарамі будуць ужо летнія алімпійцы, якім трэба будзе пазмагацца за ўзнагароды ў Рыа-дэ-Жанейра.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Арганізатарамі маштабнага праекта з'яўляюцца рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія.

Раней герояў спорту беларускія заўзятары выбіралі ў праектах «Навагодні баль — 2007. Героям спорту», «Трыумф. Героям спорту — 2008», «Трыумф. Героям спорту — 2010», «Трыумф. Героям спорту — 2012».

Фота Надзеі БУЖАН.

«Трэнер года» — Мікалай КАЗЕКА (злева). Узнагароду ўручае Юрый ЧЫЖ.

■ Наўздагон

НА ЎСЁ СВОЙ ЧАС

Чэмпіянат па біятлоне вокамгненна праляцеў на вачах трэнераў, балельшчыкаў. Здавалася, вось толькі ўчора ў Мінску адбылася святочная цырымонія адкрыцця спаборніцтваў, як хутка настаў час падводзіць вынікі. А паразважаць і сапраўды ёсць пра што. На хатнім першынстве беларусы парадавалі балельшчыкаў і паклалі ў камандную скарбонку два залатыя медалі, спыняліся ў кроку ад доўгачаканага п'едэстала. За гонкамі актыўна сярод астатніх спецыялістаў сачыў і Аляксандр СЫМАН, старшы трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі. Яму і слова. А пачнём з фінальнай эстафетнай гонкі юніёраў, у якой нашы хлопцы занялі ганаровае 5-е месца.

— У эстафеце гэта даволі добры паказчык, — кажа Аляксандр Сыман. — Усё ж такі ў барацьбе з такімі камандамі-грандамі, як Расія, Нарвегія, Францыя, Германія, хлопцы прадэманстравалі характар, свае байцоўскія якасці. У іх не зусім атрымаўся першы этап, аднак яны ўсё роўна змагаліся, рушылі наперад і адыгралі час.

— Наша каманда заваявала 2 медалі на гэтым чэмпіянаце. Ці рыхтавалі наогул медальны план перад спаборніцтвамі?

— Ведаеце, нам бы не хацелася рабіць медальныя планы ў дзіцячым спорце. Наша задача крыху іншая. Мы імкнёмся падрыхтаваць рэзерв для нацыянальнай каманды, паглядзець маладых спартсменаў у дзеянні. Каб яны атрымалі вопыт міжнародных спаборніцтваў і ў будучыні прыйшлі ў зборную.

— А ці адчуваеце задаволенасць ад выступлення нашай каманды?

— Так. 2 залатыя медалі і годнае выступленне ў пэўных гонках — гэта добры вынік. Я ўсцешаны і тым, як выступіла каманда дзяўчат. Займалі добрыя месцы і нашы юніёры. Прычым не адзін спартсмен, а цэлая група хлопцаў.

— Пры гэтым яшчэ перад стартам першынства гаварылася аб тым, што лідарамі зборнай з'яўляюцца Дзінара Алімбекава, Дар'я Блашко, Ганна Сола, Віктар Крыўко. Па вялікім рахунку, гэта пацвердзілі іх выніковыя месцы ў гонках.

— Менавіта так і атрымалася. Многія выступленні аказаліся прадказальнымі.

— Аляксандр, для нашай каманды стварылі выдатную атмасферу, умовы для падрыхтоўкі. Каманда жыла ў гасцініцы, дзе пражывае нацыянальная зборная. З ёй працаваў дыетолаг і сэрвісмены. Як атрымалася «выбіць» падобныя ўмовы?

— Безумоўна, адчувалася дапамога нацыянальнай зборнай, яе галоўнага трэнера. І вельмі прыемна, што ёсць увага да рэзерву з прычыны далейшага адсочвання і падрыхтоўкі да вялікага спорту самых таленавітых і самых здольных. Аказалі падтрымку таксама кіраўніцтва федэрацыі і Міністэрства спорту і турызму, беларускага клуба біятлона, фінансавая падтрымка якога адчувалася на працягу сезона.

— Некаторыя біятланісты, якія выступалі ў Раўбічах, неўзабаве адправяцца са сваімі камандамі на чэмпіянат свету па біятлоне ў Фінляндыю. Калі лідары гэтай каманды здолеюць выступаць за нацыянальную зборную Беларусі?

— Вялікі спорт не даруе памылак. Ён вельмі канкурэнтны і эмацыйна напружаны. Таму няхай усё адпавядае іх узросту: юнакі выступаюць сярод юнакоў, а юніёры сярод юніёраў. На прыкладзе Дар'і Домрачавай мы бачым, што яна ў свой час здолела захаваць патэнцыял, дасягнуць самых высокіх вынікаў у аптымальным узросце, працягвае радаваць нас і сёння.

— Атрымліваецца, фарсіраваць падрыхтоўку рэзерву не трэба...

— Безумоўна, не трэба. На ўсё свой час.

Тарас ШЧЫРЫ, фота аўтара.

У медальным заліку першае месца заняла ў дзвюх узроставых катэгорыях Расія. На другім месцы — Францыя, на трэцім — Нарвегія. Беларусы з 2 залатымі ўзнагародамі апынуліся на 5-м радку.

«Мы ведалі, што тут многае змянілася»

Біятлоннае першынство сярод юнакоў і юніёраў сабраў у Раўбічах не толькі таленавітую спартыўную моладзь, але і заслужаных трэнераў, славутых чэмпіёнаў свету, вядомых функцыянераў, якія ўпершыню наведалі адноўлены спарткомплекс. Аб уражаннях ад спаборніцтваў і біятлоннай арэны нам расказалі госці.

Уладзімір БРЫНЗАК, прэзідэнт Федэрацыі біятлона Украіны:

— Я ў біятлоне ўжо 40 гадоў, а таму наведваю Раўбічы далёка не першы раз. Тут заўжды было добра. Проста цяпер усё ўдасканалілі, падрыхтавалі сучасны комплекс, які можа прымаць любыя спаборніцтвы. І для нас гэта вялікая радасць, што ў Еўропе з'явіўся такі цэнтр, дзе мы можам трэніравацца. Нашы спартсмены бываюць тут кожны год, а цяпер тым больш будзем прыязджаць у Раўбічы. Дарэчы, у нас, у Карпатах, пабудавалі таксама даволі добры стадыён, і мы спадзяёмся, што будзем праводзіць там яшчэ і міжнародныя спаборніцтвы.

Два медалі ўкраінкі Юліі Журавок на гэтым чэмпіянаце, як і золата Ганны Крыванос, не сталі для нас адкрыццём. Мы заўжды разлічваем на добрыя вынікі. У любой узроставай групе мы маем спартсменаў, якія могуць змагацца за ўзнагароды.

Віктар МАЙГУРАЎ, віцэ-прэзідэнт Міжнароднага саюза біятланістаў, трохразовы чэмпіён свету:

— Спарткомплекс «Раўбічы» мае ліцэнзію катэгорыі «А», якая дае магчымасць праводзіць біятлонныя спаборніцтвы найвышэйшага ўзроўню. Уся інфраструктура гэтаму адпавядае. Але гаспадароў новых чэмпіянатаў будуць выбіраць на кангрэсе, які пройдзе праз паўтара года. Вось тады і стануць вядомыя краіны, якія прымуць чэмпіянаты 2021 і 2022 гадоў. Да таго часу каляндар ужо распісаны і зацверджаны. Што тычыцца этапаў Кубка свету, яны спланаваны да 2018 года. Але ёсць яшчэ чэмпіянат Еўропы, летняе першынство свету, з наступнага года стартуе Кубак свету сярод юніёраў, і я думаю, што Раўбічы выкажуць жаданне стаць гаспадарамі гэтых спаборніцтваў.

— Ці складана трапіць у графік правядзення этапаў Кубка свету? Шмат што залежыць у тым ліку і ад кліматычных умоў...

— Тут можна праводзіць этапы ў лютым ці нават у сакавіку. Зразумела, зіма нестабільная, аднак паглядзіце на Еўропу. Там таксама вельмі шмат праблем. І я мяркую, што ўмовы надвор'я не стануць праблемай, калі месцам правядзення выберуць Раўбічы.

— А хто са спартсменаў спадабаўся вам на гэтым першынстве?

— Мяне прыемна здзівіў Андэрс Эміл Шылеруп, спартсмен з Даніі, які заваяваў сярэбраны медаль у індывідуальнай гонцы сярод юнакоў. Мне здаецца, для яго краіны гэта першая ўзнагарода ў гісторыі на падобных спаборніцтвах. Адзначу хуткую, добрую стральбу беларускіх дзяўчат, вынікі французскай, нарвежскай і расійскіх камандаў. Наогул у Раўбічах медалі заваявалі прадстаўнікі 11 краін. І гэта сведчыць пра добрую канкурэнцыю. Галоўнае, каб усе вынікі маладых спартсменаў былі перанесены ў дарослы спорт.

Альгімантас ШАЛНА, трэнер-скаўт (ЗША), алімпійскі чэмпіён па біятлоне ў складзе зборнай СССР:

— Не быў у Раўбічах з 1990 года. За гэты час яны вельмі змяніліся. Я заўжды лічыў, што ў гэтым месцы павінны адбывацца буйныя міжнародныя спаборніцтвы. Па некаторых прычынах пэўны час тут нічога не адбывалася, але цяпер комплекс «Раўбічы» з'яўляецца адным з лепшых біятлонных цэнтраў у свеце.

— А ці ёсць умовы для падрыхтоўкі біятланістаў у ЗША?

— Мы маем і стрэльбішчы, і трасы. З гэтым праблем няма. Але біятлон у ЗША не такі папулярны. У Расіі ці, напрыклад, у Аўстрыі вядуць тэлевізійныя трансляцыі, паміж спартсменамі высокая канкурэнцыя, а ў нас... Мы набіраем тых, хто прыходзіць да нас, каго знаходзім сярод лыжнікаў. На ўсё гэта патрэбна шмат часу.

— Калі не памыляюся, летась у Амерыцы праходзіў чэмпіянат свету па біятлоне сярод юніёраў. Ці шмат балельшчыкаў сачылі за спаборніцтвамі?

— Так, у Прэск-Айле, што ў штаце Мэн. Праўда, людзей там было — 1/15 ад той колькасці балельшчыкаў, якія наведалі гонкі ў Раўбічах. У школьным аўтобусе прывезлі дзяцей. Яны бегалі па снезе, гулялі, валяліся, а біятлон ім быў не цікавы. Гэта адлюстроўвае інтарэс, хоць на гонкі прыязджалі бацькі, сябры ўдзельнікаў і падтрымлівалі біятланістаў.

— Напэўна прыехалі ў Беларусь і сустрэлі шмат знаёмых.

— Іх тут — мора. Многіх ужо не пазнаю, бо так даўно з імі не бачыўся. Але з Сяргеем Булыгіным і Юрыем Кашкаравым, з якім перамог у эстафеце на Алімпіядзе ў Сараева, пабачыліся. Тут арганізавалі трэнерскі вечар. Сядзелі доўга, размаўлялі, узгадвалі мінулае.

Томаш СІКОРА, галоўны трэнер юніёрскай зборнай Польшчы, чэмпіён свету:

— Раней я кожны год прыязджаў у Раўбічы на трэніровачныя зборы. Мне тут усё падабалася: і добрае стрэльбішча, і складаная траса... Апошні раз быў тут 11 гадоў таму, калі заваяваў два залатыя медалі на чэмпіянаце Еўропы. А калі прыехаў цяпер, перажыў прыемны шок. Мы ведалі, што тут многае змянілася, але каб настолькі... Я не ведаю, што лепш можна зрабіць для трэніровак, зімовых спаборніцтваў. Тут ідэальныя ўмовы. Я вельмі задаволены і, хто ведае, можа ўжо сёлета мы прыедзем да вас на зборы.

— Як лічыце, а ці могуць Раўбічы прыняць чэмпіянат свету?

— Могуць. Трэба толькі пашырыць трыбуны, а з астатнім усё цудоўна.

Тарас ШЧЫРЫ

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

■ На хвалі

ПІЯНЕРЫ FM-ФАРМАТУ

Часы мяняюцца — «Радыёфакт» застаецца

Праграма «Радыёфакт» Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё — гэта для многіх добрая традыцыя пачынаць новы дзень. Пачуць самыя свежыя навіны, каментарыі і кампетэнтныя меркаванні па актуальных тэмах, а таксама дакладны прагноз надвор'я заўсёды можна ў эфіры любімай праграмы. Мяняюцца часы, а «Радыёфакт» застаецца сімвалам вірлівага жыцця, падзеі якога вось ужо амаль чвэрць века фіксуюць вядучыя перадачы. Напярэдадні дня яе нараджэння пра мінулае і сённяшняе мы пагаварылі з прадстаўнікамі розных пакаленняў вядучых: галоўным дырэктарам вытворчасці радыёпраграм на Беларускім радыё Валерыем РАДУЦКІМ (з плеяды першых стваральнікаў праграмы) і намеснікам дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання Беларускага радыё Максімам УГЛЯНІЦАМ, які працуе над праектам цяпер.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Валерый Аляксандравіч, 4 сакавіка «Радыёфакт» адзначае свой дзень нараджэння. Якім было ўсё напачатку і ў чым сакрэт шматгадовай запатрабаванасці ў аўдыторыі?..

В. Р.: Мікрафон уключаны? Гэта ў нас дзяжурная фраза, інакш вядучы не пачынае гаварыць... Мы сталі першымі ў FM-фармаце, калі яшчэ ніводнай FM-станцыі не было ў Беларусі, і хацелася прыдумаць нешта новае для вяшчання. Мы бачылі прыклад «Маяка», у якога ўсё атрымлівалася, і падумалі, што і самі зможам. У той час эфірны дзень выглядаў так: быў выпуск навін, а потым выходзілі іншыя праграмы. Тады ў Галоўнай дырэкцыі інфармацыйных праграм мы вырашылі нешта змяніць і прыдумалі «Радыёфакт» — гадзінны эфір, дзе выпускі навін разбілі на блокі, плюс рэклама, невялікія аналітычныя каментарыі. І яшчэ ў нас гучала ў праграме песня. Прычым былі нават прэм'ерныя кампазіцыі, калі вядомыя беларускія калектывы прыносілі свой музычны матэрыял і ў нас ён гучаў упершыню.

«І дагэтуль робіцца стаўка на галасы. У нас у кожным рэгіёне свой чалавек, і прозвішчы нашых журналістаў на слыху».

Адміністрацыя відэахостынгу Youtube абвінаваціла ката ў парушэнні аўтарскіх правоў на... варкатанне. Карыстальніку прыйшло папярэджанне, што правамі на варкатанне яго хатняга гадаванца валодаюць кампаніі PRS і EMI.

Карыстальнік Digihaven запампаваў на Youtube відэа з запісам варкатання свайго ката Фантома. Дзякуючы паўторам, 12-секундное варкатанне расцягнулася прыкладна на гадзіну. Відэа прызначалася для рэлаксацыі і дапамогі людзям, якія хочуць хутчэй заснуць. Карыстальнік загрузіў ролік яшчэ ў сакавіку 2014 года. Амаль праз год яму прыйшло папярэджанне ад адміністрацыі Youtube, у якім гаварылася, што кот Фантом парушае аўтарскія правы. Аказалася, што яго варкатанне афіцыйна належыць кампаніям PRS і EMI. Гаспадара ката здзівіла, што ў яго гадаванца ёсць праблемы з законам. Digihaven у адказ падаў скаргу, пасля чаго вынесенае папярэджанне было знята.

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ — ПРЫЧЫНА РАЗВОДАЎ

Як меркавалася раней і было пацверджана параўнальна нядаўна, сацыяльныя сеткі не лепшым чынам уплываюць на сямейнае жыццё.

Брытанскія юрысты назвалі Facebook трэцяй па значнасці прычынай усіх разводаў, бо менавіта ў гэтай сацыяльнай сетцы, як высветлілася, муж і жонка часцей за ўсё даведаюцца аб нявернасці сваіх палавінак.

Спецыялісты з юрыдычнай кампаніі Lake Legal правялі аналіз шлюбаразводных спраў, якімі ім давялося займацца ў апошні час. У выніку была зроблена выснова, што Facebook дае сваім карыстальнікам магчымасць аднавіць кантакт з былымі каханымі, з якімі яны не мелі зносін доўгі час. Пры гэтым у сацыяльных сетках людзі часам раскрываюць такія падрабязнасці свайго жыцця, якія потым можна выкарыстоўваць у судзе. У выніку грамадзяне, якія выкрылі здраду жонак або мужоў, прыводзяць гэтыя звесткі ў якасці падстаў для скасавання шлюбу.

Эксперты вывучылі 200 шлюбаразводных спраў і высветлілі, што прыкладна ў траціне гэтых выпадкаў былі выкарыстаныя звесткі, якія муж ці жонка самі выкладвалі ў Facebook. Пры гэтым прадстаўнік фірмы Stowe Family Law Джуліян Хоўкхэд таксама паведаміў, што да яго супрацоўнікаў рэгулярна звяртаюцца кліенты, якія знайшлі доказы нявернасці сваёй жонкі ці мужа ў сацыяльнай сетцы.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС

■

■ Наўздагон

АХ, ГЭТЫ «ОСКАР»!

Ёсць рэчы, якія многія наўрад ці ведаюць пра цырымонію ўзнагароджання прэміяй «Оскар»: напрыклад, тое, што пазалочаная статуэтка Оскара, якой шчасліўчыкі радасна махаюць на сцэне, важыць амаль чатыры кілаграмы!

КАНТРАКТ. Калі акцёр адчувае фінансавыя цяжкасці, продаж пазалочанай узнагароды можа здацца спосабам хутка знайсці грошы. Але з 1950 года ўладальнікам «Оскараў» даводзіцца падпісваць абавязацельства: калі яны захочуць прадаць сваю статуэтку, то павінны спачатку прапанаваць яе кінаакадэміі за адзін долар. Крыўдна, ці не так?

ЗОЛАТА. Усім вядома, што «Оскар» залаты, але не ўсе ведаюць, што ён сапраўды пакрыты 24-каратным золатам. Золата, між іншым, досыць цяжкі матэрыял, так што ўявіце, колькі важыць 35-сантыметровая статуэтка. Падчас Другой сусветнай вайны з-за недахопу металу кінаакадэмія прыняла рашэнне выкарыстаць гіпсавыя ўзнагароды, але яны былі заменены, як толькі дэфіцыт мінуў.

АДМОВА. Можна падумаць, што любы, хто атрымае ўзнагароду за лепшую ролю, павінен скакаць ад захаплення! Але толькі не Марлон Брандо. У 1973 годзе ён адмовіўся ад узнагароды і папрасіў аб'явіць аб сваім рашэнні прадстаўніцы амерыканскіх індзейцаў Сашын Літлфэзер. Брандо і Літлфэзер такім чынам выказалі пратэст супраць абуральнага паказу індзейцаў у галівудскіх фільмах.

ПРАКЛЁН. Цікавыя вынікі дало даследаванне, праведзенае ў 2011 годзе: высветлілася, што лаўрэаткі «Оскара» за лепшую жаночую ролю разводзяцца больш чым у паўтара раза часцей, чым астатнія намінанты. Гэты факт нават атрымаў назву: «Любоўны праклён «Оскара». Зрэшты, ці сапраўды справа ў праклёне, або прычыну разводаў варта шукаць у рэўнасці мужоў да поспеху сваіх палавінак — гэтага мы ніколі, напэўна, не даведаемся.

ПЕРАСТРАХОЎКА. У 2003 годзе раён тэатра «Кодак» у Лос-Анджэлесе (месца ўручэння прэмій «Оскар») быў абвешчаны зонай без палётаў. У мэтах бяспекі былі нават завараны ўсе каналізацыйныя люкі. Больш за тое, вакол былі размешчаны снайперы і спецыяльная каманда выяўлення хімічнай зброі.

КРАДЗЕЖ. У 2000 годзе 55 статуэтак «Оскар» былі скрадзены ў порце. 52 з іх неўзабаве знайшлі побач са сметнікам. Яшчэ адна статуэтка была знойдзена падчас спецаперацыі па пошуку наркотыкаў у Маямі праз два гады, а тыя два прызы, што засталіся, па-ранейшаму лічацца «зніклымі без вестак».

ВЫКАРЫСТАННЕ. Не ўсе лаўрэаты, здаецца, цэняць сваіх «Оскараў» аднолькава высока. Як бы там ні было, легенда кампаніі Pixar Джон Ласетэр апрануў свае два «Оскары» ў касцюмы лялькі Барбі, а славуты акцёр Джэк Нікалсан выкарыстоўвае свой як вешалку для галаўных убораў.

КРЭАТЫЎ. Няма нічога дзіўнага ў тым, што Уолт Дысней атрымаў «Оскар», але яго ганаровы «Оскар» за «Беласнежку» быў зусім асаблівым. Ён уяўляў сабой адну вялікую статуэтку, да якой прыкладаліся яшчэ сем маленькіх. Іншы лаўрэат прэміі, акцёр і чэрававяшчальнік Эдгар Берген, атрымаў драўляную статуэтку з рухавым ротам!

НЯДЗЕЛЯ, 8 САКАВІКА

БЕЛАРУСЬ 1

7.35 Камедыя «Жаночы дзень».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40 XXL WOMAN TV.
10.15, 0.05 Серыял «Крыху не ў сабе».
11.20 «Пра ежу!».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
13.05 Тайны следства.
13.40 Каробка перадач.
14.15 «Terra incognita». Беларусь невядомая.
14.45 Нашы.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 «Вялікі рэпартаж».
16.45 Выйсце ёсць.
17.20 Камедыя «Тата напрокат». 1-я — 4-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Камедыя «Утаймаванне свавольных».
21.30 Камедыя «Вяселле лепшага сябра».
23.20 Ток-шоу «Перазагрузка».
0.05 Меладрама «ANглійская руская».

БЕЛАРУСЬ 2

6.55 Камедыя «Шукайце жанчыну».
9.25 Вышэй за дах.
10.00 «Fitnews».
10.40 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.15, 20.25 Тэлебарометр.
11.20 М/с «Пінгвіны з Мадагаскара».
12.15 Я хачу гэта ўбачыць.
12.55 Серыял «Ландыш серабрысты».
14.35 Меладрама «Д'ябал носіць «Prada».
16.35 «Comedy woman».
17.55 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
19.15 Суперлато.
20.05 Кіпень.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.30, 16.25, 0.20 Калейдаскоп.
8.10 «Саламяны капялюшык». Камедыя.
10.20 «Подых струн». Музычная праграма. Госць — Артур Шуляк.
11.00, 16.20 «Размаўляем па-беларуску».
11.05 «Наперад у мінулае».
11.35 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
12.40 «Тутсі». Меладрама.
14.35 «Дзеля жанчын, дзеля жанчын ...». Міжнародны гала-канцэрт зорак аперэты.
16.35, 18.15 «Трое ў лодцы, калі не лічыць сабаку». Камедыя.
17.40 «Культпрасвет».
19.20 «Мы з джаза». Камедыя.
20.45 Калыханка.
21.00 Да Дня жанчын. Святочны канцэрт. Выканаўцы: Маладзечанскі сімфанічны аркестр музычнага каледжа ім. М. Агінскага. Дырыжор — Р. Сарока.
22.30 «Цёмны бок страсці». Драма.

БЕЛАРУСЬ 5

6.40, 0.45 PRO спорт. Навіны.
7.10 Гандбол. SEHA-ліга. БГК ім. Мяшкова — «Татран».
8.35 Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Мужчыны.
10.00 Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт. Жанчыны.
11.35, 19.05 Баскетбол. НБА. «Кліўленд» — «Фінікс».
13.20 Хакей. КХЛ. Чвэрцьфінал Заходняй канферэнцыі. Шосты матч.
15.10, 21.50 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
16.05 Свет англійскай прэм'ер-лігі.
16.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
16.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Паўфінал. Другі матч.
20.55 Біятлон. Чэмпіянат свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
22.35 Баскетбол. НБА. «Голдэн Стэйт» — «Кліперс».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.35 Кіно ў колеры. «Вясна на Зарэчнай вуліцы».
11.20 «Брэйн-рынг».
12.40 «Чаго хочуць жанчыны».
13.40 «Голас. Дзеці».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Першая сусветная. «Урачы і медсёстры».
17.10 Маст. фільм «Масква слязам не верыць».

20.00 Контуры.
21.05 «Танцуй!».
23.25 «Легенды «Рэтра FM».

СТБ

6.00 Серыял «Студэнты International». Заключныя серыі.
7.25 «Скардзіцца дазваляецца».
7.45, 16.50 «Аўтапанарама».
8.10 Камедыя «Міс Кангеніяльнасць 2: чароўная і небяспечная».
10.15 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 «На 10 гадоў маладзейшыя».
12.10, 14.15, 0.25 Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».

13.30, 16.30 «24 гадзіны».
13.40 «Добры дзень, доктар».
15.35 «Далёкія сваякі».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.30 Меладрама «Паненка-сялянка».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Анжалі-ка, маркіза анёлаў».
22.40 «Дакументальны праект»: «Анатомія цудаў».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».
11.50 Маст. фільм «Рымскія канікулы».
14.00 Маст. фільм «Утаймаванне свавольнага».
16.15 Серыял «Вясковая камедыя».
20.15 Маст. фільм «Два дні».
22.05 Маст. фільм «Мой лепшы палюбоўнік».
0.00 Маст. фільм «Ахоўнік для дачкі».
2.00 Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
4.30 Маст. фільм «Дзяўчына з характарам».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА».
7.10 Маст. фільм «Начны госць».
8.50 Маст. фільм «Утаймавальніца тыграў».
10.50, 14.20 Маст. фільм «Лекарка».
14.00 Весткі.
18.10 Маст. фільм «Сюрпрыз для каханага».
20.00 Весткі тыдня.
21.55 «Петрасян і жанчыны».
0.05 «Нядзельны вечар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05, 8.20 Серыял «НЗ — надзвычайнае здарэнне».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.15 «Я худзею».
14.10, 16.20 Серыял «Дазнаўца».
17.10, 19.40 Серыял «Тамбоўская ваўчыха».

8 КАНАЛ

9.00, 14.15, 18.55, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.05 «Адшукваецца адпачынак».
10.40 Меладрама «Масква слязам не верыць».
13.15 Дак. фільм «Невядомая версія».
14.20 Камедыя «Па-банку».
16.15 «МакаShow».
16.30 «Сёння клюе».
17.00 «Хатняя крама».
18.00, 23.40 «Хобі TV».
19.00 Камедыя «Лютыя стварэнні».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Мемуары гейшы».

ВТВ

6.00, 5.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Варонiны».
10.00, 2.00 «Турбаміксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
13.30, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 «Кіно ў дэталях».
15.00, 19.00 «Уральскія пельмені».
16.30 Меладрама «Даруй, хачу з табой ажаніцца».
18.50 Скетч-шоу «6 кадраў».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 «Людзі Хэ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 Скетч-шоу «Валера-ТБ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Андрэй Міронаў. «Брава, Артыст!».
10.35 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».
11.50 «Больш, чым каханне». Анатоль Папанаў і Надзея Каратаева.
12.30 Краіна птушак. Дак. фільм «Пустэльнікі ракі Пры».
13.10 «Пешшу...». Масква жаночая.
13.40 «АББА. Даба Ду».
14.40 Спектакль тэатра Сатыры «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро». Запіс 1973 года.
17.30 Дак. фільм «Андрэй Міронаў. «Глядзіце, я іграю...».
18.15 «Рамантыка раманса». Ларыса Галубкіна.
19.10 «Лінія жыцця». Яўгенія Дабравольская.
20.00 Маст. фільм «Артыстка».
21.40 Дак. фільм «Невядомая Піяф».
22.50 Маст. фільм «Гукі музыкі».
1.35 М/ф для дарослых «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан».
1.55 «Шукальнікі». «Уваскрэслыя трафеі Напалеона».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 Дак. фільм «Настальгія па Ташкенце».
6.40, 8.30, 9.40, 11.00, 12.55, 14.30, 15.55, 17.25, 19.00, 20.35, 22.15, 23.25, 1.05, 2.25, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.20 «Да і пасля...». Год 1956. 1-я частка. 2008 год.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
12.00 «Народжаныя ў СССР». «8 Сакавіка». 2008 год.
13.20, 19.20 Юбілейны канцэрт групы «Зямляне». 2008 год.
15.00 «Быў час»: «Мода пасавецку». 2006 год.
16.30 «Спяем, сябры». Госць праграмы Івар Калныньш. 2008 год.
18.00 «Назад у СССР». «Самая абаяльная і прывабная». 2007 год.
21.00 «Яловая субмарына»: «Песні святаў». Госць Дыяна Берлін. 2005 год.
22.30, 1.30 «Народжаныя ў СССР». 2005 год.
0.00 «Яловая субмарына»: «The Beatles». 2005 год.
4.00 «Народжаныя ў СССР».

EUROSPORT

3.00, 15.15, 0.15 Біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
3.30, 17.45, 0.45 Біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
10.30, 16.00, 23.00, 2.30 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
11.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
12.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
14.00 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
18.45 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні.
19.45 Веласпорт. Парыж — Ніца.
21.00 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
1.30 Канькабежны спорт.

КАМЕДЫЯ

6.00, 3.10 Серыял «Пэт і Кэбедж».
6.25 Камедыя «Улётны рэйс».
7.55 Камедыя «Помста сябровак нявесты».
9.25, 17.40 Серыял «Месяцовы хлопчык».
10.15 Камедыя «Святоша».
12.15 Камедыя «Магутныя качаняты».
14.00, 14.50, 15.30 «Камедыянты (шоу)».
14.25, 15.15, 18.05, 20.00, 22.55, 0.45, 2.55, 5.40 Скетч-ком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Я і яго былыя».
18.20 Камедыя «Сямейны план».
20.20 Камедыя «Як ажаніцца і застацца халастым».
22.00 Серыял «Татуля». 1 і 2 серыі.
23.10 Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
1.15 Камедыя «Усё ўключана 2».
4.05 Камедыя «All inclusive, або Усё ўключана!».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.10, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
11.10 «Паненка і кулінар».
11.40, 2.15 Серыял «Тайны следства».
15.10 «Сто пытанняў даросламу».
16.00 Маст. фільм «Шукайце маму».
17.50 «Без падману».
18.40 «Доказ віны».
19.30 Маст. фільм «Сэрцаедкі».
21.50 «Асцярожна, махляры!».
22.20 «Часова даступны».
23.20 Дак. фільм «Мужчына і жанчына. Адчуйце розніцу».
0.45 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

TV 1000 ТБ1000

6.00 Драма «Дзіця з Марса».
9.00 Камедыя «Як па масле».
10.30 Драма «МЫ. Верым у каханне».
12.30 Баявік «Напруж звіліны».
14.30, 2.20 Камедыя «50 «першых пацалункаў».
16.15 Драма «Сумны Валянцін».
18.15 Камедыя «Даю год».
20.00 Драма «Джэйн Эйр».
22.15 Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
0.30 Трылер «Крумкач».

4.05 Драма «Аўгуст Раш».

РУССКОЕ КИНО TV 1000 ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.50 Прыгоды «Грэчаскія канікулы».
8.30 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
10.00 Драма «Царскае паляванне».
12.20 М/ф «Вяртанне Бураціны».
13.45 Драма «Маладая жонка».
15.25 Драма «Танец Дэлі».
17.10 Камедыя «Хлопец з Марса».
18.45 Камедыя «Вось гэта каханне!».
20.20 Камедыя «З 8 Сакавіка, мужчыны!».
22.00 Камедыя «Нерэальнае каханне».
23.30 Драма «Нябесны суд».
1.10 Драма «Нябесны суд. Працяг».
4.50 Прыгоды «Прыватнае піянерскае».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 8.35 Займальная навука.
6.20, 17.15 Гульня ў лікі.
6.45 Зрабі або памры.
7.30 Паядынак непераможных.
8.15 Гульні розуму.
8.55 Навуковыя недарэчнасці.
9.20, 10.25, 12.40, 16.30 Кіраванне натоўпам.
9.40 Космас: Прастора і час.
11.10 Навука будучыні.
11.55 Больш чым фокусы.
13.25 Паветраныя асы вайны.
14.10, 19.30 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
14.55 Дзікая прырода Амазонкі.
15.45 Мядзведзі вострава Страху.
18.00 Гісторыя ежы.
18.45 Міжнародны аэрапорт Дубай.
21.00, 0.45, 3.45 Тайнае жыццё апосталаў.
21.45, 1.30, 4.30 Дзесяць пакаранняў смерцю егіпецкіх.
22.30, 2.15 Фатальная стыхія.
23.15, 3.00 Уварванне на Зямлю.
0.00, 5.15 Рэальнае паранармальнае.

DISCOVERY

8.00 Склады.
8.50, 2.20 Бітва за нерухомасць.
9.40 Бітвы за кантэйнеры.
10.30, 4.00 Чыгунка Аляскі.
11.20 Хлопцы з Юкана.
12.10 Мяцежнікі ледзянога возера.
13.00 Голыя і напалоханыя.
13.50, 3.10 Гульня на выжыванне.
14.40 Беар Грылс: выпрабаванне страхам.
15.30, 18.00, 22.10, 5.35 Хуткія і гучныя.
16.20, 23.00 Дылетант супраць эксперта.
17.10, 23.50 Паляўнічы на цуды.
20.30 Залатая ліхаманка.
0.40 Брыстальскі заліў.
1.30 Геній аўтадызайну.
4.50 Як гэта ўстроена?
5.10 Як гэта зроблена?

■ Будзьце пільнымі!

Я САМ АШУКВАЦЦА РАДЫ

Да маіх шматлікіх суседзяў па пад'ездзе, у асноўным пенсіянераў, патэлефанавалі ў дзверы прыемныя маладыя хлопцы, якія прадставіліся супрацоўнікамі фірмы, што правярае якасць вады. Яны прадэманстравалі хімічны эксперымент, які павінен быў пераканаць, што трэба прымаць тэрміновыя меры па выратаванні ўсіх. Яшчэ 30 хвілін «бла-бла-бла» — і некаторыя клюнулі на «суперпрапанову» — установку фільтра ў крэдыт за немаведама якую суму. Зразумела, «са зніжкай — толькі для вас». Вечарам дадому з працы вярнулася маладое пакаленне, якое расказала бабулям і дзядулям, колькі насамрэч каштуе тое абсталяванне, якім «ашчаслівілі» старых. Некаторыя плакалі ад крыўды.

Патэлефанавала мне знаёмая, 80-гадовая заслужаная настаўніца, і з бязмежнай радасцю паведаміла, што купіла свайму праўнуку коўдрачку з воўны ламы для здаровага сну. «Для дзіцяці ж нічога не шкада», — гаворыць і называе завоблачную цану. Аказваецца, яны з сяброўкай схадзілі на прэзентацыю прадукцыі супераздараўленчых медыцынскіх вырабаў. Ім далі купон на зніжку 30% і пераканалі, што без вырабаў з ламы ў доме жыццё страчвае сэнс. Дарэчы, праз тыдзень, калі жанчына абмеркавала сваю пакупку з сябрамі, горка прызналася: «Ну вось, зноў мяне падманулі...»

Да швагеркі нейкі смуглявы інтэлігентны чалавек пад'ехаў у двары на чорным прыгожым аўто з замежнымі нумарамі. Мужчына на ламанай мове прапанаваў набыць набор металічнага посуду вядомага брэнда. Сказаў, што вяртаецца ў Малдавію, а праз мяжу ўсё роўна не правязе тавар, таму прадае танна — за «сімвалічную» суму ў валюце. Згадзіўся пачакаць, пакуль тая пазычыць у суседзяў неабходныя грошы. У выніку, калі вечарам яе дачка «пагугліла» і назвала рэальную цану той кітайскай падробкі, жанчыне стала дрэнна.

Вы ці вашы блізкія траплялі ў падобныя сітуацыі? Чаму мы робім учынкі, якія супярэчаць нашым уласным інтарэсам? Што аб'ядноўвае быццам бы розныя прапановы, на якія паддаюцца людзі розных узростаў і ўзроўню адукаванасці? Псіхолаг Таццяна САСНОЎСКАЯ нагадвае, што нам усім уласціва базавая патрэба ў бяспецы, якую эксплуатуюць тыя, каму трэба прадаць нейкі тавар. Калі проста: нас спачатку банальна пужаюць, пасля чаго прапаноўваюць рашэнне, якое павінна пазбавіць ад гэтага страху:

— Напрыклад, паказваюць страшылку пра кляшчоў-сапрафітаў, якія быццам бы выклікаюць жудасныя хваробы. І тут жа прапаноўваюць набыць кітайскі пыласос. Дэманструюць дзіцячы дослед гідролізу вады, узяты з кніжкі пра забаўляльную хімію — і адразу ж «толькі гэты дарагі фільтр пазбавіць вас ад такой брыдоты»... Прыкладаў безліч. А справа ў тым, што ва ўсіх людзей глыбока ўнутры ёсць страх смерці, які можа выяўляцца па-рознаму. Напрыклад, страхам цемры, вышыні, хваробы. Чалавек нават можа не ўсведамляць, чаго насамрэч ён баіцца. Менавіта таму яму прапануюць нешта, што быццам дазволіць жыць вечна. Напрыклад, той жа цудадзейны фільтр або біядабаўкі, якія пазбавяць яго ад усіх хвароб. Дарэчы, і фільтры, і біядабаўкі, і пыласосы бываюць вельмі добрай якасці, але часта нядобрасумленныя прадаўцы выдаюць звычайны ці зусім нізкаякасны тавар за эксклюзіўны. І вось тут важна не стаць ахвярай ашуканца.

— Хто часцей за ўсё паддаецца на прапановы нядобрасумленных прадаўцоў, махляроў па сумяшчальніцтве?

— Простага рабочага чалавека гэтыя ўсе «прыёмчыкі» хвалююць мала, бо ў яго няма нейкіх надуманых страхаў — калі ён рэалізаваны на працы, у калектыве. Для яго падставамі для неспакою з'яўляецца толькі недахоп рэальных жыццёвых патрэб. Напрыклад, нявыплата зарплаты, падаражанне харчавання. А тое, што вада ў кране не вельмі добрай якасці... Ён скажа: «Не дурыце мне галаву, хто прыдумаў тыя мікробы? Усё жыццё піў, і ўсё нармальна было!». Ахвярамі страхаў, а ўрэшце, і ашуканства часцей за ўсё становяцца людзі трывожныя, уражлівыя, не рэалізаваныя. Калі ж чалавек разумее, чаго яму сапраўды не хапае ў жыцці, яго наўрад ці падмануць. Напрыклад, ён асэнсоўвае, што не рэалізаваны на рабоце, не можа знайсці агульную мову з сям'ёй, адзінокі...

— Атрымліваецца, што ў нас вельмі многія не ўсведамляюць, чаго ім сапраўды не хапае для шчасця?

— Так, і купляюць нейкую зусім непатрэбную рэч, умоўную «таблетку шчасця». Дарэчы, прафесійныя прадаўцы адзін і той жа сродак для розных людзей прэзентуюць па-рознаму, каб адпавядаць спадзяванням канкрэтнага пакупніка. Бабулі скажуць: купіце біядабаўку, і вам будзе лёгка падымацца па прыступках, дзяўчыне: вы пахудзееце і на вас будуць азірацца маладыя людзі; жанчыне сярэдняга ўзросту: будзеце прыгожай, як 20 гадоў таму... Пры гэтым біядабаўка будзе адна і тая ж. І гэта нармальна, так дзейнічаюць законы маркетынгу. Але калі той маркетынг становіцца яшчэ адным спосабам адабрання апошняга ў спажыўцоў, якія бяруць крэдыты, пазычаюць грошы дзеля пакупкі «цуда»-тавару, гэта выклікае справядлівы гнеў. Да таго ж у нас дастаткова людзей, якія адчуваюць сябе непатрэбнымі, нерэалізаванымі, няшчаснымі. А тым часам некаторыя нядобрасумленныя прадстаўнікі сеткавага маркетынгу ім гавораць: мы дадзім вам шчасце. Людзей запрашаюць у спецыяльныя салоны, дзе ім прапануюць: пасядзіце, паляжыце на нашых цудадзейных ложках. Давайце вам зробім масаж, прыходзьце яшчэ. Пераконваюць: бачыце, як вам добра? Пенсіянеры ходзяць, з імі там ветліва размаўляюць. Урэшце старым становіцца няёмка — з імі ж так добра гутарылі. І ад гэтага пачуцця няёмкасці яны купляюць абсалютна непатрэбныя рэчы, якія каштуюць іх гадавую пенсію.

— І ўсё ж, як трэба сябе паводзіць, каб не застацца на бабах? Ці гэта непазбежна?

— Нас лягчэй падмануць, калі мы прымаем рашэнне імпульсіўна і пад уздзеяннем эмоцый. У многіх з тых, хто нам спрабуе нешта прадаць, асноўны прынцып такі: купляйце зараз, заўтра будзе позна. Сёння ж зніжка. Гэта ўсё робіцца для таго, каб чалавеку не даць часу падумаць, параіцца. Менавіта таму глабальным прыёмам можна назваць больш цесную супольнасць з іншымі людзьмі. Любы чалавек адчувае сябе мацнейшым, калі ён можа з кімсьці абмеркаваць праблему. Яго цяжэй «развесці» на непатрэбную пакупку. У любым выпадку, калі нейкі тавар вам навязваюць, трэба спыніцца і не згаджацца адразу. Хаця б патэлефануйце іншаму чалавеку, спытайце яго думку, зайдзіце ў інтэрнэт, пачытайце там розную інфармацыю пра гэты тавар ці фірму. Калі не можаце самі, папрасіце гэта зрабіць сваякоў ці сяброў. Бо часта ахвяра гандляра знаходзіцца пад уплывам пэўнага гіпнозу, абаяння, пачуцця няёмкасці. Мы ж часта лічым, што калі нам нешта нязначнае далі, мы павінны аддаць амаль усё. Гандляр прыйшоў да мяне, прапыласосіў дыванок, патраціў паўгадзіны, я яму за гэта нешта павінен. Купіць непатрэбны мне пыласос, напрыклад. Нас запрашаюць на нейкія прэзентацыі, частуюць, а потым прымушаюць купляць непатрэбныя рэчы за нечуваныя грошы. Падумайце вельмі добра, ці сапраўды вам патрэбна пэўная рэч за такі вялікі кошт?

— Да таго ж вакол шмат людзей, пакрыўджаных на грамадства, на жыццё, на сваякоў... Здаецца, ім асабліва патрэбна «таблетка шчасця».

— Так, людзі з пазіцыяй «мне недадалі» ў першую чаргу паддаюцца маніпуляцыям. Таму тут патрэбна гаварыць пра тое, як імкнуцца дасягаць унутранай раўнавагі, якая робіць нас абароненымі — у тым ліку ад усялякіх гандляроў «таблеткамі шчасця». Заўважце, тыя, хто нешта робіць для іншых, хто дапамагае суседзям, сябрам, сваякам — у іх куды лепшы ўнутраны эмацыянальны стан, чым у тых, хто адчувае сябе пакрыўджаным. Самыя лепшыя рэчы ў свеце — бясплатныя: сям'я, сябры, каханне, любоў, павага, спакой, шчасце ўрэшце. Мы гэта атрымліваем, толькі калі нешта важнае аддаём іншаму. Шчасце — гэта ніколі не ўнутр сябе, гэта заўсёды вонкі. Чалавека напаўняе аддача. Яна нейтралізуе дрэнныя эмоцыі. Калі табе дрэнна — дапамажы іншаму, і табе стане лепш. Не радуйся, што яму яшчэ больш дрэнна, чым табе, а шчыра дапамажы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

■ Неасабісты суб'ектыў

КРЭДЫТНАЯ ГІСТОРЫЯ

Як сямнаццаць рублёў могуць сапсаваць настрой і рэпутацыю

НЯДАЎНА прыходзіць мне SMS-паведамленне ад банка: «У вас узнікла запазычанасць па крэдыце. Каб пазбегнуць налічэння штрафных санкцый, тэрмінова заплаціце!» Ні табе «шаноўны кліент», ні табе «калі ласка» — коратка і грозна, яшчэ і з клічнікам. І хоць чарговы крэдытны плацеж я пагасіла за тыдзень да крайняга тэрміну, адчула сябе раптам ніякавата, бы злодзей, якога за руку злавілі. Тэлефаную па ўказаным нумары і асцярожненька так у ветлівага аператара пытаюся: маўляў, скажыце мне, мадмуазель, што я там вашаму банку павінна? А яна мне гэтаксама ветліва ў адказ: «У вас узнікла запазычанасць — сямнаццаць рублёў»... Далей наш дыялог нагадваў удалую мініяцюру з перадачы «Рассмяшы коміка». «Колькі-колькі? Сямнаццаць тысяч?» — «Не, сямнаццаць рублёў». — «А ці нельга іх перакінуць на наступны плацеж?» — «Можна, але гэта будзе лічыцца запазычанасцю і адаб'ецца на вашай крэдытнай гісторыі». — «А дзе я вам вазьму сямнаццаць рублёў? Мне іх што, намаляваць?» — «Заплаціце пяцьдзясят». — «А з якой ласкі я павінна вам дарыць аж трыццаць тры рублі?» — «Можаце не плаціць, але гэта адаб'ецца на вашай крэдытнай гісторыі...»

Крыху ачмурэўшы ад гэткага дыялогу, я, праклінаючы ўсё на свеце, пасунулася пад дажджом на пошту (банк той не самы буйны, таму плацяжы прымаюцца не ўсюды). Галоўная думка была не пра тыя няшчасныя сямнаццаць рублёў, а пра тое, навошта мне быў той крэдыт увогуле...

ПАЧЫНАЛАСЯ ўсё ў канцы мінулага мая ў заапарку. Субота выдалася па-летняму спякотнай з самай раніцы, мы ўжо шкадавалі, што туды паехалі, і ад душы зайздросцілі львам, якім ад той гарачыні толькі задавальненне было. І тут — званок на мабільны: «Шаноўная Алена Леанідаўна, наш салон прыгажосці запрашае вас на бясплатны комплекс касметычных працэдур у любы зручны для вас час...» Тут бы шаноўнай Алене Леанідаўне задумацца: калі не аб тым, адкуль у таго салона нумар яе мабільнага, дык хаця б аб тым, пра што яе газета не раз чытачоў папярэджвала: у падобнай рэкламе слова «бясплатны» — абсалютна дэкларатыўнае, не больш. Ці хаця б аб тым, навошта на касметычных працэдурах абавязкова мець пашпарт. Але тады, пэўна, мазгі ад сонца размякчыліся, бо, пакінуўшы львоў, арлоў, курапатак і іншую жыўнасць без належнай увагі, я ўжо праз паўгадзіны мчала з Чыжоўкі ва Уручча на «бясплатныя касметычныя працэдуры»...

Карацей, скончылася ўсё тым, што выйшла ваша пакорная слуга з таго салона з дыягназам «усё запушчана, але паправіць можна», з чамаданчыкам цудадзейнай касметыкі, уласна і прызначанай, каб усё паправіць, і... з крэдытам на кругленькую суму. Чамаданчык той каштаваў нятанна (а вельмі ж хацелася!), а тут (такая ўдача!) у касметычным салоне, аказалася, працуе прадстаўнік банка, які хуценька афарміць крэдыт, і, калі раскласці яго па месяцах на год, зусім не шмат атрымаецца. Гэта ўжо пасля, уключыўшы, нарэшце, мазгі і логіку, я ўбачыла, што амаль трэць сумы, якую павінна буду заплаціць на працягу года, пойдзе ўласна банку (сорак тры працэнты гадавых — гэта вам не жарты), што датэрміновае пагашэнне не прадугледжана. Але на дагаворы стаяў мой уласны подпіс, пасля бойкі кулакамі махае толькі вядома хто, а я і так не вельмі разумнай сябе адчувала.

Крэдыт мне выплачваць яшчэ аж да чэрвеня. Упэўненасць у тым, што сума кожны месяц нязначная, памяншаецца разам з колькасцю цуда-крэму ў прыгожым начынні. І гісторыя з сямнаццаццю рублямі пры ўсёй сваёй абсурднасці вельмі нават лагічна дапаўняе развіццё падзей.

ТАМУ што лёгкіх і хуткіх грошай, як бы іх ні рэкламавалі лістоўкі ў метро і дыджэі на радыё, не бывае — іх усё роўна давядзецца вяртаць, прычым больш, чым бярэш (прычым бярэш чужыя, а вяртаеш свае, зароблены!). Таму што, як бы соладка ні гучала назва крэдыткі, так падобная да нашага любімага «халява», і колькі б ты на тую крэдытку такіх патрэбных, проста неабходных у жыцці рэчаў (кшталту прылады для варкі яек без шкарлупіны) ні набраў, «халявы» не будзе — усё роўна давядзецца расплачвацца сваімі. Якія якраз у той момант, калі трэба пагашаць даўгі (а пазней нельга, бо сапсуецца крэдытная гісторыя!), могуць спатрэбіцца на штосьці сапраўды важнае — на лекі, напрыклад. Таму што, узяўшы нават не вельмі вялікі крэдыт дзеля нечага, што можна было б не купляць увогуле або праз нейкі час купіць, не залазячы ў пазыку, ты перастаеш быць свабодным чалавекам, бо трапляеш у залежнасць ад крэдытора. І нясешся пад дажджом плаціць сямнаццаць рублёў, бо інакш ён напіша гэта ў тваю асабістую крэдытную гісторыю і тады ты не зможаш выехаць за мяжу або іншы банк можа не выдаць табе чарговы крэдыт...

І гэта, апошняе, зусім не жарт. Мая маладая калега купіла ў крэдыт мабільны тэлефон. Выплаты штомесячныя былі невялікія, але тэрмін пагашэння стаяў — 18-га. Аванс у дзяўчыны быў 20-га, і, не бачачы ў тым ніякай крамолы, яна 20-га тыя належныя сумы акуратна кожны месяц на рахунак банка і клала. Выплаціла — і забылася. Праз два гады давялося ўспомніць са слязьмі, калі пачала афармляць крэдыт на будаўніцтва такой доўгачаканай кватэры. У банку ёй адмовілі. Усплыла гісторыя з тэлефонам. І як ні плакала яна, даводзячы: «Я ж плаціла пастаянна, толькі на два дні пазней!», у адказ пачула катэгарычнае: «Калі вы так безадказна паставіліся да невялікага крэдыту, чаго ад вас чакаць, калі атрымаеце буйны?»

...Плацежны тэрмінал злосна выплюнуў маю картку са словамі: «Некарэктная сума плацяжу». Не прыняў, зараза, ні сямнаццаць рублёў, ні нават пяцьдзясят. Давялося стаяць у чарзе да акенца, дзе здзіўленая кабета аформіла мой плацеж. Сямнаццаць, як вы разумееце, заплаціць не ўдалося. Атрымалася, ледзь не ўтрая пераплаціла. Цікава, ці знойдзе гэта адлюстраванне ў маёй крэдытнай гісторыі?

Алена ЛЯЎКОВІЧ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом (поз. 9 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля» (далее – конкурс)

Предмет конкурса: право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом (поз. 9 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля».

Наименование объекта строительства: «Многоквартирный жилой дом (поз. 9 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля».
Земельный участок для размещения и строительства многоквартирного жилого дома (поз. 9 по генплану) располагается согласно проекту застройки микрорайона №59 г. Гомеля, 2-я и 3-я очереди строительства (далее – проект), разработанному ОАО «Институт «Гомельгражданпроект», в Советском административном районе г. Гомеля.
Участок строительства свободен от застройки и имеет спокойный рельеф, образованный за счет намыва песка. На участке присутствует древесно-кустарниковая растительность, которая не имеет декоративно-художественного назначения.
На данном земельном участке запроектирована необходимая инженерная инфраструктура, для решения локального обеспечения проектируемого объекта. Инженерно-техническое обеспечение объекта выполнить согласно техническим условиям заинтересованных организаций.
Строительство многоквартирного жилого дома на данном участке регламентируется красными линиями проектируемых улиц согласно проекту застройки микрорайона №59, противопожарными и санитарными нормативами согласно ТНПА.
На данном земельном участке имеется необходимая инженерная инфраструктура: совокупность инженерных коммуникаций (магистральные сети, объекты и сооружения), необходимых для решения локального обеспечения предлагаемых объектов.

Место проведения конкурса: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина, 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8(0232)746371.

Порядок проведения конкурса: определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
Конкурс проходит в два этапа.
Первый этап – предварительный квалификационный отбор.
Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта.

Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов:
Срок подачи заявлений на участие в предварительном квалификационном отборе: рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – до **27 апреля 2015 г. до 16.00. Заявление и документы для предварительного классификационного отбора представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Предварительный квалификационный отбор для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «Многоквартирный жилой дом (поз. 9 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля» На конверте указывается наименование претендента.
«Образец заявления» размещен на сайте www.gomel-region.gov.by в разделе «Строительство и архитектура». Претендент предоставляет следующие документы на русском языке, подтверждающие экономическое и финансовое положение претендента:
1. копия (без нотариального засвидетельствования) устава имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации;
2. бухгалтерская отчетность за последние отчетный год и период;
3. справка о коэффициентах платежеспособности претендента (коэффициент текущей ликвидности, коэффициент обеспеченности собственными оборотными средствами, коэффициент обеспеченности финансовых обязательств активами и другое), рассчитанных в установленном законодательством порядке;
4. расчеты прибыли за последние три года;
5. расчет стоимости чистых активов претендента на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
6. сведения о дебиторской и кредиторской задолженностях, в том числе просроченных свыше трех месяцев, на первое число месяца, предшествующего месяцу подачи заявления на участие в конкурсе;
7. справка о задолженности по платежам в бюджет на 1 число месяца подачи заявления на участие в конкурсе;
8. справка об аудиторской проверке деятельности организации-претендента;
9. справка о платежеспособности из банка, в котором обслуживается претендент;
10. документы, содержащие сведения о возведении многоквартирных жилых домов за последние три года и сроках ввода их в эксплуатацию, заказчиком (застройщиком) по которым является претендент.
Кроме этого, претендентом представляются подтвержденные документально сведения:
- о деловой репутации претендента (не менее 3-х отзывов);
- о наличии опыта работ по строительству многоквартирных жилых домов за последние три года;
- о выполнении аналогичных проектов, сопоставимых по виду и объему с объектом строительства (реализованных, нереализованных);
- об участии претендента в качестве ответчика в судебных или арбитражных процессах с указанием предмета иска за последние три года;
- о наличии наложенного ареста на имущество претендента.

Предоставление задатка на участие в конкурсе на этапе предварительного квалификационного отбора не требуется.
Предложения, представленные позже указанного срока, к рассмотрению не принимаются. Конкурсная комиссия имеет право продлить срок подачи заявлений.

Дата, время и место проведения предварительного квалификационного отбора	**30 апреля 2015 г. 11.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1 этаж, зал заседаний)**

К участию в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта допускаются претенденты, прошедшие предварительный квалификационный отбор, внесшие в установленном порядке задаток, своевременно подавшие конкурсное предложение и прилагаемые к нему документы.

Подробности о предмете конкурса, состав конкурсного предложения, перечень прилагаемых к нему документов отражены в конкурсной документации. Конкурсная документация предоставляется секретарем комиссии претендентам, прошедшим предварительный квалификационный отбор, не позднее трех рабочих дней после перечисления задатка и подачи заявления на участие в конкурсе по адресу:246000,Республика Беларусь, г. Гомель, проспект Ленина, 2, каб. 405, тел. 746371.
Задаток **в сумме 50000000 бел. руб. перечисляется на р/с 3015056440074 в филиале 300 ГОУ АСБ Беларусбанк, получатель ГУ «Гомельоблстройкомплекс», адрес банка: 246050, г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, получатель: государственное учреждение «Гомельское областное управление строительным комплексом», адрес: 246050, г. Гомель, ул. Советская, 28. УНП490321784, т./ф.: 740394, 748831.** Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе (2 этап).

Дата, время и место приема конкурсного предложения и прилагаемых к нему документов: рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений на участие в конкурсе – **13 мая 2015 г. до 13.00. Заявление и конкурсные предложения представляются** секретарю конкурсной комиссии по адресу: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр-т. Ленина, 2, каб. 405, тел. (80232) 74-63-71 в запечатанном конверте с надписью «Конкурсное предложение для участия в конкурсе по выбору заказчика (застройщика) по строительству «Многоквартирный жилой дом (поз. 9 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля» «Не вскрывать!». На конверте указывается наименование претендента.
Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение в любое время, но не позднее 5(пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по выбору победителя конкурса.

Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса: в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов.

Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов: 14 мая 2015 г. 11-20. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1 этаж, зал заседаний)

Дата, время и место выбора победителя конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта: 26 мая 2015 г. 12.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1 этаж, зал заседаний).
Претенденту, не победившему в конкурсе, возвращается задаток в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя.

Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса: не позднее 20 дней с момента утверждения организатором конкурса протокола о выборе победителя. Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта.

Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса (расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затрат на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством) **осуществляется победителем конкурса** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса.

Информация о проведении конкурса, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов, предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гомельского облисполкома **http://gomel-region.gov.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор конкурса) извещает о проведении конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом (поз. 14 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля» (далее – конкурс)

Предмет конкурса: право выступать заказчиком (застройщиком) по строительству объекта «Многоквартирный жилой дом (поз. 14 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля».

Наименование объекта строительства: «Многоквартирный жилой дом (поз. 14 по генплану) в микрорайоне № 59 г. Гомеля».
Земельный участок для размещения и строительства многоквартирного жилого дома (поз. 14 по генплану) располагается согласно проекту застройки микрорайона № 59 г. Гомеля, 2-я и 3-я очереди строительства (далее – проект), разработанному ОАО «Институт «Гомельгражданпроект», в Советском административном районе г. Гомеля.
Участок строительства свободен от застройки и имеет спокойный рельеф, образованный за счет намыва песка. На участке присутствует древесно-кустарниковая растительность, которая не имеет декоративно-художественного назначения.
На данном земельном участке запроектирована необходимая инженерная инфраструктура, для решения локального обеспечения проектируемого объекта. Инженерно-техническое обеспечение объекта выполнить согласно техническим условиям заинтересованных организаций.
Строительство многоквартирного жилого дома на данном участке регламентируется красными линиями проектируемых улиц согласно проекту застройки микрорайона № 59, противопожарными и санитарным нормативами согласно ТНПА.
На данном земельном участке имеется необходимая инженерная инфраструктура: совокупность инженерных коммуникаций (магистральные сети, объекты и сооружения), необходимых для решения локального обеспечения предлагаемых объектов.

Место проведения конкурса: 246000, Республика Беларусь, г. Гомель, пр. Ленина 2, Гомельский областной исполнительный комитет, тел. 8(0232)746371.

Порядок проведения конкурса: определен Положением о порядке организации и проведения конкурсов по выбору заказчика (застройщика) по строительству многоквартирных жилых домов, за исключением жилых домов повышенной комфортности, в г. Минске и областных центрах (далее – Положение), утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 10 сентября 2013 г. № 798 (Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 19.09.2013, 5/37805).
Конкурс проходит в два этапа.
Первый этап – предварительный квалификационный отбор.
Второй этап – конкурс по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта.

Дата, время и место приема заявления на участие в конкурсе и прилагаемых к нему документов:
